# Айва — гэта водар вясны

## Фотакарэспандэнт і журналіст «Р» паглядзелі, як на палескім балоце цвіце сад японскай айвы

**РЭПАРЦЁР**

Валянціна КАЗЛОВІЧ
koziovich@sb.by

**Знакамітае ААТ «Палескія журавіны», што ў Пінскім раёне, — не толькі самае вялікае прадпрыемства ў Еўропе па вырошчванні буйнаплодных журавін. Акрамя балотных ягад, на плантацыях можна ўбачыць буякі, парэчкі, абляпіху, а з нядаўніх часоў — хенамелес, ці айву японскую. Зараз чароўны час яе цвіцення.**



ФОТА ПАЎЛА БОГУША



Суквецці айвы заварожваюць сваёй прыгажосцю.

лакном. Нечакана Васіль Рыгоравіч дастае з кішэні нажніцы і па-гаспадарску абрэзвае сухую галінку. Акуратна паднімае суседнюю ў квецені, на якой ужо завязалася мноства міні-яблычкаў. Каб яны набралі сілу, айве патрэбен догляд.

Культура гэтая своеасаблівая. З аднаго боку, не зусім капрызная, — Васіль Лягускі паказвае на з'едзеныя зайцамі верхавінкі галінак. — Вось нашкодзілі. Але айва возьме сваё, адрасце, яна добра пераносіць стрыжку. З часам сфарміруем куст. З другога боку, ... журавіны» — адзінае прамысловае прадпрыемства ў краіне, якое адвяло пад культуру ажно пяць гектараў. У мінулым годзе сабралі першыя 10 тон ураджаю, сёлета плануюць каля 20.

Васіль Лягускі — чалавек з багатым гаспадарчым вопытам. Хваліцца не хоча, пра планы гаворыць асцярожна, бо, кажа, толькі маці-прырода ведае, які вынік будзе восенню.

Айва цвіце ў маі і чэрвені. Бліжэй да лета колер кветак становіцца больш насыча-

На «Палескіх журавінах» з айвовых яблычак робяць цукаты і сіроп. Дарэчы, плод гэты надта карысны — і ў танізуючым напоі добры, і ў лячэбным адвары ў дапамогу пры павышаным ціску і для зніжэння ўзроўню халестэрыну.

Адначасова з айвой на плантацыях цвітуць садовыя буякі (па-народнаму — лахачы). Кусты высокія, прыгожыя, праўда, не такія яркія, як айва. Але ж буякі — папулярныя сярод насельніцтва ягады. Яны прыносяць прадпрыемству добры прыбытак. На Палессі зараз культывуюць больш за 50 гатункаў. Што тычыцца галоўных ягад — журавін, то чэкі пакуль пустыя. Высаджваць іх пачнуць крыху пазней.

Дарэчы, з новых культур тут не толькі айва. Пасадзілі яшчэ два гатункі актынідыі (міні-ківі).

Менш за год таму прадпрыемства ўвяло ў эксплуатацыю новы пункт сартыроўкі і перапрацоўкі ягаднай прадукцыі. Ёсць там машына для электроннай ачысткі ягад, якая дазваляе перабіраць за змену да васьмі тон. А на ўчастку перапрацоўкі — лінія па вытворчасці цукатаў.





Дырэктар ААТ «Палескія журавіны» Васіль ЛЯГУСКІ па-гаспадарску аглядае будучы ўраджай.

Айва пахне яблыкам, лімонам і сасной аднначасова. Да гаючага водару ў паветра дабаўляецца пах травы, торфу і вады. Прайсці міма абсыпаных кветкамі кустоў хенамелесу і не звярнуць на іх ўвагі проста немагчыма. Хочацца стаяць і любавацца яркімі фарбамі, а адышоўшы, так і цягне азірнуцца. Уявіце, да чаго прыгожая майская раніца ў гэтым садзе!

Дыхайце, атрымлівайце асалоду, у мяне тут санаторый, — кажа дырэктар прадпрыемства Васіль Лягускі.

Мы ідзём уздоўж кустоў, высаджаных у рады і на ўзроўні зямлі прыкрытых агравагога боку, патрэбны вада і падкормка. Мы выкарыстоўваем толькі арганіку, ніякай хіміі. Ад хвароб расліна абараняе сябе сама. Апыляюць яе пчолы і чмялі — у нас своя пасека побач з плантацыяй. Так што нашы яблычкі растуць экалагічнымі.

> Зараз «Палескія журавіны» — адзінае прамысловае прадпрыемства ў краіне, якое адвяло пад культуру ажно пяць гектараў. У мінулым годзе сабралі першыя 10 тон ураджаю, сёлета плануюць каля 20

Айву японскую ў Беларусі культывавалі ў часы Савецкага Саюза. А зараз «Палескія ны. Плады, вага якіх можа дасягаць 100 грамаў, зажаўцеюсь, нальюцца вітамінамі ў верасні — кастрычніку. Збіраць ураджай будуць уручную. На галінках няма калючак, як на звыклай для многіх з нас садовай айве, што часцей выкарыстоўваецца ў ландшафтным дызайне для стварэння зялёнай агароджы. Куст можа пладаносіць да 80 гадоў.



Вага спелага «яблычка» можа дасягаць нават 100 грамаў.

Рынак дыктуе, трэба ўдасканальваць абсталяванне, каб быў замкнёны цыкл, — кажа Васіль Лягускі.

Хочацца дадаць, што ААТ «Палескія журавіны» — любімае месца для многіх беларускіх фатографаў. Здымкі падчас збору журавін б'юць рэкорды па праглядзе, бо яны не толькі маляўнічыя, але і ў многім экзатычныя. Запоўненыя вадой чэкі і тэхніка ў вадзе на плантацыях буйнейшай журавінавай гаспадаркі Еўропы — гэта сапраўднае дзіва, вачэй не адарваць. ●